действенность речи героев произведений. В рамках данного условия мы знакомим детей с произведениями художественной литературы на занятиях и в свободное от занятий время, используя приёмы: словесное рисование, чтение «с продолжением», совместный с педагогом анализ действенности средств коммуникации в речи литературных героев, проблемно-игровые ситуации, постановка этюдов по сюжетам художественных произведений, сценарное программирование.

*Третье условие* — взаимодействие ДОУ и семьи в аспекте формирования действенности речи у детей старшего дошкольного возраста. Учитывая положение, что результативность работы по формированию действенности речи у дошкольников может быть достигнута лишь посредством усилий всех участников процесса, мы считаем необходимым и особенно важным координацию деятельности педагогов и родителей, единство их позиций и требований. Исходя из поставленной цели следует предусмотреть ряд форм работы с родителями: консультации, актуализирующие проблему формирования действенности речи у детей старшего дошкольного возраста; родительские собрания; вечера вопросов и ответов; педагогическая гостиная; памятки для родителей, где помещены советы, пожелания по поводу того, как организовать чтение ребёнка в домашних условиях, и др.

От процессуального блока переходим к технологическому. Технологический блок представлен: формами работы (занятия по ознакомлению с художественной литературой, театрализованная деятельность); методами и приёмами обучения действенности речи (чтение художественной литературы, аналитическая беседа, объяснение, показ, проблемные вопросы, постановка и решение коммуникативных задач, анализ коммуникативных ситуаций и др.); средствами (детская художественная литература, театрализованная игра).

Методический блок предполагает работу по методическому обеспечению и информационному просвещению педагогов и родителей и представлен следующими формами работы: индивидуальные и групповые консультации, круглый стол, дискуссии, родительские вечера, проведение педагогического совета, теоретические семинары и семинары-практикумы, выставки, мастер-классы.

Результативный блок включает критерии, показатели и уровни сформированности действенности речи у детей старшего дошкольного возраста.

**Заключение.** Реализация педагогических условий, по нашему мнению, способствует формированию действенности речи у детей старшего дошкольного возраста. Приоритетным средством реализации данного процесса выступает детская художественная литература.

Пристальное внимание к развитию коммуникативных способностей поставило на повестку необходимость формирования действенности речи у детей старшего дошкольного возраста. По нашему мнению, это будет являться основой эффективной коммуникации, которая в дальнейшем будет положительно влиять не только на взаимодействие с окружающими, но и на самооценку ребёнка, её внутренние характеристики: адекватность представлений о себе и о своих возможностях, уверенность в собственных силах и эмоциональную комфортность.

**Список цитируемых источников**


1. *Зимняя, И. А.* Лингвопсихология речевой деятельности / И. А. Зимняя. — М. : Моск. психол.-соц. ин-т, 2001. — 432 с.
2. *Мурашов, А. А.* Культура речи : учеб. пособие / А. А. Мурашов. — М. : Моск. психол.-соц. ин-т : МОДЭК, 2004. — 272 с.
3. *Головин, Б. Н.* Основы культуры речи : учеб. для вузов / Б. Н. Головин. — М. : Высш. шк., 1988. — 320 с.


УДК 373.2


**В. М. Шавель**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*


## РАЗВІЦЦЁ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ ПРАЗ ВЫКАНАННЕ ГУЛЬНЁВЫХ ЗАДАННЯЎ ПА АНАЛІЗЕ І СКЛАДАННІ КАЗАК ПРА ЖЫВЁЛ

**Уводзіны.** Маўленне, з'яўляючыся сродкам засваення грамадска-гістарычнага вопыту, садзейнічае актывізацыі інтэлектуальнай дзейнасці (успрымання, памяці, мыслення, уяўлення) і выконвае пазнавальную функцыю. Дзіця, кантактуючы з дарослымі, засвойвае значэнне слоў, правілы пабудовы сказаў, атрымлівае магчымасць далучыцца да агульначалавечага вопыту. У дашкольным узросце ствараюцца толькі перадумовы для паўнацэннай рэалізацыі гэтых задач у ходзе наступных ступеняў развіцця.

**Асноўная частка.** Важнае значэнне мае казка як сродак развіцця мовы дзяцей, яе змест — першы ўзор мастацкага слова. Яна найбольш адпавядае свету дзіцячых уяўленняў, гульняў. Дзецям імпануе ў казках увесь лад думак, вобразаў, свабодная, імправізацыйная форма апавядання. Яны з вялікай ахвотай расказваюць казкі дома, сябрам, вучацца складаць іх па аналогіі з прачытанай. З задавальненнем слухаюць і інсцыніруюць дашкольнікі казкі пра жывёл.

Агульныя рысы казак — наяўнасць у іх фантазіі, выдумкі, асаблівасці мастацкай формы, якія ствараюць адметны казачны стыль, дыдактычная накіраванасць — «па-рознаму праяўляюцца ў кожным з відаў казачнага эпасу» [1, с. 9].

© Шавель В. М., 2017

Рэпазіторый БарДУ

Казкі пра жывёл вельмі старажытныя па сваім паходжанні. Як сведчыць назва, галоўнымі персанажамі гэтага віду казак з’яўляюцца жывёлы; побач з імі дзейнічаюць птушкі, расліны, а ў некаторых казках і чалавек. Вельмі важнай асаблівасцю казак пра жывёл з’яўляецца тое, што «амаль ва ўсіх творах дзеючыя асобы вызначаюцца найбольш тыповымі для іх якасцямі: асноўная рыса лісіцы — хітрасць («Лісіца-хітрыца», «Як кот звяроў напалохаў» ), ваўка — прагнасць («Хітры вол», «Дурны воўк»), ката — мудрасць («Кот і дурань», «Каток, пеўнічак і лісічка»). Такім чынам, перад намі паўстаюць не толькі цікавыя, жывыя, з характэрнымі асаблівасцямі паводзін і знешняга выгляду вобразы са свету жывёл, але ў першую чаргу вобразы-абагульненні, якія раскрываюць перад слухачом у шматграннасці праяў сяброўства і здраду, бескарыслівасць і прагнасць, справядлівасць і ашуканства. Вобразы казак пра жывёл вылучаюцца мастацкай дасканаласцю і лагічнай завершанасцю» [2, с. 239].

У цэнтры ўвагі пры аналізе зместу казак павінна быць выяўленне тыповых рыс галоўных персанажаў, адметных асаблівасцей гэтага жанру.

Адной з важных адзнак, што характарызуе казачны эпас са знешняга боку, Я. Ф. Карскі лічыў наяўнасць рыфмы, асабліва ў прыказках-зачынах і канцоўках: сказы, якія ідуць адзін за адным, рыфмуюцца, у дзеясловах унутры сказа, у апошніх словах: «Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак («Курачка-рабка»)» [2, с. 241].

У пабудове казак пра жывёл звычайна ёсць усе састаўныя часткі класічнай казкі: прыказка-зачын, завязка дзеяння, яго развіццё, фінал і канцоўка, хаця такая класічная схема не заўсёды вытрымліваецца, што залежыць і ад майстэрства казачніка, і ад характару твора, дынамічнасці развіцця яго сюжэта. У казках пра жывёл «ужываецца рэтардацыя, трохкратны паўтор дзеяння (лісіца тройчы крадзе пеўня, воўк тройчы спрабуе з'есці казлянят і г. д.), агульныя месцы і інш.» [2, с. 242].

Дашкольнікі з задавальненнем складаюць свае казкі пра вядомых ім жывёл. На занятках выхавацель можа выкарыстоўваць гульні-заданні, якія будуць рыхтаваць дзяцей да самастойнага складання казак. Напрыклад, гульня «Розныя словы» садзейнічае развіццю назіральнасці і ўмення пазнаваць шматпланавую сутнасць акаляючай рэчаіснасці. На занятках гульня можа быць рэалізавана ў розных варыянтах, напрыклад:

– «Падбор прыметнікаў» — выхавацель паказвае малюнак ці называе слова, а ўдзельнікі павінны назваць як мага больш прымет. Выйграе той, хто назаве як мага больш прымет, напрыклад: сабака — вялікі, лахматы, злосны, добры, вясёлы, паляўнічы, стары, надзейны;

– «Распазнаванне» — выхавацель прапануе словы, якія павінны быць звязаны з пачуццёвым і практычным вопытам дзіцяці, напрыклад: калючы, маленькі, жвавы — вожык; хітрая, вёрткая, рыжая — ліса;

– «Ланцужок слоў». Сутнасць гульні заключаецца ў падборы слоў — назоўнікаў і прыметнікаў, якія характарызуюць у сваім аб’яднанні які-небудзь аб’ект падобнымі якаснымі прыметамі. Выхаванцы складаюць своеасаблівы «цягнік» са слоў, дзе словы-вагончыкі злучаны паміж сабою, напрыклад:

— Ліса бывае якая?

— Рыжая, хітрая, маленькая.

— Хто яшчэ бывае маленькі?

— Вожык, зайчык, ваўчаня.

Казкі пра жывёл у большасці сваёй апавядаюць пра пэўныя падзеі, здарэнні, разгортваючы іх перад слухачом у строгай паслядоўнасці. Каб узбагаціць лексічны запас выхаванцаў словамі-дзеяннямі, варта выкарыстоўваць гульню «Хто што робіць», якая не толькі актывізуе маналагічнае маўленне, але і выразнасць невербальных сродкаў уздзеяння на слухачоў. Даследчык В. А. Белабрыкіна вылучае некалькі спосабаў арганізацыі такога гульнёвага дзеяння:

– для гульні неабходны набор прадметных малюнкаў. Дзецям паказваюць малюнкі па адным і задаюць пытанні«: Што робіць? Што з ім можна рабіць?»;

– са старэйшымі дашкольнікамі гульня можа праводзіцца без нагляднай асновы. Вядучы называе жывёлу, а дзеці па чарзе называюць дзеянне, якое можа выконваць жывёла, і слова-назоўнік для наступнага ўдзельніка, напрыклад, вядучы гаворыць: «Заяц». Дзіця адказвае: «Скача. Вавёрка». Потым да аднаго слова-назоўніка прыдумваюць некалькі дзеясловаў;

– гульню можна ўскладніць за кошт выкарыстання невербальных сродкаў выразнасці: жэстаў, мімікі, пантамімікі. Задача дзяцей — назваць дзейнасць па адным ці некалькіх дзеяннях [3].

Важнае месца ў казках пра жывёл займае дыялог, які дае здольнаму казачніку вельмі шырокія магчымасці для імправізацыі, пераўвасаблення. Па асаблівасцях кампазіцыі сярод казак пра жывёл вылучаецца група ланцугападобных. Ад іншых твораў казачнага эпасу яны «адрозніваюцца тым, што лёгка падзяляюцца на асобныя сюжэтныя звенні. Кожнае са звенняў сюжэтнага ланцуга ўключае ў сябе ўсе дэталі папярэдняга звяна і яшчэ нешта новае. З кожнай новай, наступнай ступенню павялічваецца колькасць дзеючых асоб, адбываецца так званае “нарашчэнне” дзеяння. Па такому прынцыпу пабудаваны казкі “Курка-рабушка”, “Верабей і былінка” і інш.» [2, с. 242]. Выкарыстанне гульнёвага практыкавання «Дабаўленне» дазваляе актывізаваць дзейнасць дзяцей малодшага ўзросту да дагаворвання слоў у сказах, а старэйшага — самастойна праводзіць лексічны адбор:

– «Прапушчаныя словы» — арганізатар гульні вымаўляе сказ, а дзеці ўстаўляюць прапушчанае слова, напрыклад: «Шэрсць у кошкі…, кіпцікі…»;

– «Сінанімічныя рады» — перад тым як пачаць гульню, разам з дзецьмі варта высветліць значэнне, падабенства і адрозненне зместу слоў, якія могуць быць выкарыстаны, напрыклад: дом — церам — палац, лес — бор — бярэзнік.

Так, у слоўнікавы запас выхаванцаў увойдуць словы, якія маюць тонкія адценні значэнняў.



Рэпазіторый БарДУ

Каб папярэдзіць цяжкасці, з якімі могуць сутыкнуцца выхаванцы пры самастойнай кампазіцыйнай пабудове казак, можа быць прапанаваны алгарытм на аснове карт У. У. Пропа. Знаёмства з картамі павінна праходзіць паступова, у пэўнай сэнсавай паслядоўнасці і падпарадкоўвацца шэрагу патрабаванняў, распрацаваных В. А. Белабрыкінай [3, с. 178]:

1) вырабляючы карты-апоры, неабходна выбраць для абазначэння функцыі такі знак, які быў бы зразумелы дзецям, або разам з імі абгаварыць кожны малюнак;

2) пры чытанні і падзеле казкі на сэнсавыя часткі патрэбна абгаварыць кожную з іх з выхаванцамі, даць ёй назву. Калі прапанавана некалькі назваў, блізкіх па сэнсе, то варта выбраць самую дакладную, ёмістую;

3) сумесны пошук і выяўленне функцый у зноў прапанаваных для праслухоўвання казках;

4) самастойны пошук функцый спачатку на матэрыяле знаёмых, затым новых казак;

5) цэласнае засваенне казачных функцый;

6) складанне казак. Пачынаць прыдумваць казкі лепш за ўсё калектыўна і выкарыстоўваючы абмежаваны набор карт, тады рэалізацыя мэты будзе больш прадуктыўнай. Паступова для казкі дадаецца па 3-4 дадатковыя карты;

7) праца з індывідуальным наборам карт. Кожны выхаванец атрымлівае ўласны камплект карт і працуе з ім па сваім меркаванні — прыдумвае новы твор або мадыфікуе знаёмы. Спачатку можна прапаноўваць гатовую назву казкі (напрыклад, «Казка пра зайца»), абгаворваць месца дзеяння і колькасць персанажаў — такі прыём аблягчае самастойную творчасць. Пасля гэтага дзейнасць выхаванцаў набывае поўную самастойнасць: яны самі прыдумваюць назву, месца дзеяння, герояў і вызначаюць іх колькасць, сэнсавую нагрузку, надзяляючы кожнага з іх адпаведнымі маральнымі якасцямі, вобразнымі характарыстыкамі.

Варыянты работы з картамі У. У. Пропа па складанні казачных сюжэтаў могуць быць самыя розныя: складанне па чарзе, групамі, з канца, з сярэдзіны; выкарыстанне карт па парадку, праз адну, наўздагад, па вызначанай колькасці; дзяленне казкі на сэнсавыя часткі (завязка, канфлікт, развязка); выбар галоўнага героя; мадыфікацыя знаёмай казкі за кошт абмежавання або павелічэння выкарыстаных функцый.

**Заключэнне**. Беларускія казкі пра жывёл — частка казачнага эпасу славянскіх народаў — узбагачаюць паэзію славян новымі сюжэтамі, вобразамі, мастацкімі сродкамі. Хаця большасць сюжэтаў беларускіх казак пра жывёл мае паралелі з казкамі іншых народаў і адзначана ў міжнародных паказальніках, многія беларускія творы або дапаўняюць і пашыраюць вядомыя сюжэты, або зусім не маюць варыянтаў у вусна-паэтычнай творчасці славян. Метадычна правільна праведзены аналіз казак, сістэма прадуманых гульнёвых заданняў садзейнічаюць паспяховай падрыхтоўцы выхаванцаў да самастойнага складання казак.

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Кабашнікаў, К. П.* Сустрэчы з казкай / К. П. Кабашнікаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1984. — 132 с. (12).
2. Беларуская народна-паэтычная творчасць : вучэб. дапам. для філал. фак. вну / В. К. Бандарчык [і інш.] ; пад агул. рэд. М. Р. Ларчанкі. — Мінск : Выш. шк., 1979. — 448 с. (6).
3. *Белобрыкина, О. А.* Речь и общение : популяр. пособие для родителей и педагогов / О. А. Белобрыкина. — Ярославль : Акад. развития : Академия К°, 1998. — 240 с.



УДК 373



**Е. А. Шанц,**
*кандидат педагогических наук, доцент*
*Бюджетное учреждение высшего образования Ханты-Мансийского автономного округа-Югры «Сургутский государственный педагогический университет», Сургут, Российская Федерация*


## ХАРАКТЕРНЫЕ ОСОБЕННОСТИ СОЦИАЛЬНОЙ АКТИВНОСТИ ДОШКОЛЬНИКА

**Введение.** Современный период, отличающийся кардинальными изменениями, ставит проблему формирования нового человека, социально активного, способного к творческой, преобразовательной деятельности, готового принимать самостоятельные решения. Эти требования, предъявляемые обществом, относятся и к современному дошкольному образованию. Они предполагают, прежде всего, необходимость создания оптимальных условий для воспитания активности личности, направленной на полноценное взаимодействие с окружающей средой в соответствии с возрастными особенностями и возможностями.

Целесообразность формирования на этапе дошкольного детства личности, не пассивно созерцающей действительность, а активно преобразующей её, обозначена в ряде исследований и нормативных правовых документах. Так, в Федеральном государственном образовательном стандарте дошкольного образования отмечено, что необходимо «поддерживать инициативу детей в различных видах деятельности» [1], определены основные положения по формированию не просто социального индивида, а социально активной личности. Социальная активность не возникает спонтанно. Для её формирования необходима целенаправленная работа с дошкольного детства, поскольку здесь закладывается фундамент личности, развиваются её многообразные отношения с миром.


© Шанц Е. А., 2017





Репозиторий БарГУ